УДК [94+329.1/6](476)

***Сугака Наталля***
*Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі*
*і радыеэлектронікі, Мінск, Беларусь*

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ І ГРАМАДСКІЯ АБ’ЯДНАННІ НА БЕЛАРУСІ: РЭТРАСПЕКТЫЎНЫ АГЛЯД

Артыкул прысвечаны гісторыі стварэння і дзейнасці палітычных партый на Беларусі. Разглядаецца працэс фарміравання партый з XIX ст. і да сучаснасці.

***Ключавыя словы: палітычная партыя, шматпартыйнасць***

Часам стварэння палітычных партый на беларускіх землях стаў канец XIX – пачатак XX стст. У 1893 г. у выніку аб’яднання рэвалюцыйных груп утварылася Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага (з 1900 г. – Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы). З 1897 г. пачаў дзейнічаць Усеагульны яўрэйскі саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд). У 1898 г. у Мінску адбыўся І з’езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП). Найбольш актыўную дзейнасць партыя разгарнула пасля другога з’езда, які адбыўся ў 1903 г. у Брусэле і Лондане. У 1902 г. аформілася Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў). Азначаныя партыі былі нелегальнымі, накіраванымі супраць самадзяржаўя. Зімой 1902–1903 гг. была створана Беларуская рэвалюцыйная грамада, якая пазней стала называцца Беларускай сацыялістычнай грамадой (БСГ). Яна вяла барацьбу за абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, прызнанне правоў народаў на аўтаномію.

Актывізацыя грамадска-палітычнага жыцця і дзейнасці палітычных партый у Беларусі назіраецца ў гады Першай Расійскай

рэвалюцыі 1905–1907 гг. У гэты час насельніцтва атрымала грамадзянскія правы і свабоды, дзейнасць партый стала легальнай. У гэты час з’явіліся партыі манархічнага (Партыя рускага сходу, Саюз рускага народу)і ліберальна-буржуазнага напрамку (партыі кадэтаў і акцябрыстаў) [1, с. 346-352].

Пасля паражэння Першай Расійскай рэвалюцыі кіраўнікі і актыўныя ўдзельнікі рэвалюцыйных выступленняў трапілі пад арышты. Левыя партыі і арганізацыі скарацілі ці ўвогуле прыпынілі сваю дзейнасць. Былі аслаблены партыі ліберальна-буржуазнага кірунку. Беларуская сацыялістычная грамада як палітычная партыя перастала існаваць. Яе кіраўнікі сканцэнтравалі сваю ўвагу на легальнай дзейнасці і аб’ядналіся вакол газеты «Наша ніва» (1906–1915 гг.) [1, с. 361-362].

У гады Першай сусветнай вайны (1914–1918 гг.)партыі акцябрыстаў і кадэтаў заявілі аб падтрымцы знешняй палітыкі ўрада Расіі. Большасць эсэраў і меншавікоў прытрымліваліся абаронцкай пазіцыі. Крытычнае стаўленне да вайны заняла партыя бальшавікоў. Адбыліся змены ў беларускім нацыянальным руху. Даваенныя беларускія нацыянальна-культурныя арганізацыі распаліся. Газета «Наша ніва» была закрыта. Ва ўсходняй, неакупіраванай частцы Беларусі нацыянальны рух быў спынены. На акупіраванай тэрыторыі у Вільні былі створаны «Беларускі клуб», згуртаванне «Золак», «Навуковае таварыства», «Беларускі вучыцельскі саюз» і інш. Кіраваў усёй гэтай работай створаны ў 1915 г. у Вільні Беларускі народны камітэт, які ўзначальваў А. Луцкевіч. Цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху па-за межамі краю былі Петраград, Масква і іншыя расійскія гарады, дзе бежанцы-беларусы ўтварылі свае суполкі.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. спрыяла актывізацыі дзейнасці партый. Рашуча ў гэты перыяд дзейнічала РСДРП(б), асабліва ў Мінску. Бальшавікі мелі свае фракцыі ў Саветах рабочых і салдацкіх дэпутатаў, гарадской думе, цэнтральным гарадскім бюро прафсаюзаў. Пасля ІІ Надзвычайнай Паўночна-Заходняй абласной партыйнай канферэнцыі РСДРП(б), якая адбылася 5–7 кастрычніка 1917 г., назіраўся колькасны рост членаў і пашырэнне ўплыву бальшавікоў сярод працоўных мас і салдат Заходняга фронту.

Вясной 1917 г. узнавіла сваю дзейнасць БСГ. Яна была найбольш масавай беларускай партыяй і налічвала каля 5 тыс. актыўных членаў. БСГ падтрымала Часовы ўрад, адстойвала стварэнне федэратыўнай Расіі, у склад якой увойдзе аўтаномная Беларусь. У 1917 г. дзейнічала 14 нацыянальных партый. Сярод іх: Беларускія хрысціянскія дэмакраты (БХД), Беларуская партыя народных сацыялістаў

(БПНС), Беларуская партыя аўтанамістаў, Беларуская народная грамада і інш. 25 сакавіка і 8–12 ліпеня 1917 г. ў Мінску адбыліся першы і другі з'езды беларускіх нацыянальных арганізацый. Першапачаткова быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт. У яго склад увайшло 18 чалавек, з іх 10 прадстаўлялі БСГ. На другім з'ездзе замест скасаванага Беларускага нацыянальнага камітэта была створана Цэнтральная рада беларускіх арганізацый (з кастрычніка 1917 г. – Вялікая беларуская рада). Асноўным праграмным патрабаваннем Рады з'яўлялася прызнанне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі.

24 – 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе адбылася сацыялістычная рэвалюцыя. Да ўлады прыйшла партыя бальшавікоў. Найбольш уплывовай нацыянальнай партыяй у Беларусі па ранейшаму заставалася БСГ. Аднак члены гэтай партыі па рознаму ставіліся да Кастрычніцкай рэвалюцыі і не выпрацавалі агульнапартыйнай лініі ў адносінах да гэтай гістарычнай падзеі. У выніку адбыўся раскол партыі на памяркоўных (прыхільнікаў рэформ) і радыкалаў (прыхільнікаў бальшавіцкага кірунку). Многія дзеячы БСГ схіляліся да ідэі дзяржаўнага адасаблення Беларусі ад Расіі.

Важнай палітычнай падзеяй стаў Першы Усебеларускі з'езд. Ён адбыўся 15–17 снежня 1917 г. у Мінску. У ім прынялі удзел 1872 дэлегаты. У палітычных адносінах гэта былі галоўным чынам эсэры і члены БСГ. Негледзячы на тое, што з'езд быў разагнаны, ён паставіў пытанне аб самавызначэнні Беларусі. Спробай яго рэалізацыі на буржуазнай аснове з'явілася абвяшчэнне ва ўмовах нямецкай акупацыі Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Асноўныя пасады ў складзе Народнага сакратарыята (урада БНР) займалі ў большасці прадстаўнікі БСГ. Пасля таго, як 25 красавіка 1918г. на закрытым пасяджэнні Рады быў прыняты тэкст тэлеграмы германскаму імператару Вільгельму II, у радах урада БНР і БСГ узнік востры палітычны крызіс. Ён прывёў да расколу БСГ. З яе прыхільнікаў утварыліся новыя партыі: сацыялістаў-рэвалюцыянераў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-федэралістаў.

Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны і вызвалення ад нямецкіх войск тэрыторыі Беларусі далейшае грамадска-палітычнае развіццё і рэалізацыя ідэі стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове была звязана з дзейнасцю Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі (КП(б)Б).

Ідэя стварэння КП(б)Б зарадзілася на канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б), якая праходзіла ў Маскве 21–23 снежня 1918 г. Арганізацыйна КП(б)Б аформілася на VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б), якая адбылася ў Смаленску 30–31 снежня 1918

г. Па прапанове А.Ф. Мяснікова канферэнцыя абвясціла сябе I з’ездам КП(б)Б. Работу партыйных арганізацый узначальвала Цэнтральнае Бюро. У яго склад уваходзілі 15 членаў на чале з В.Г. Кнорыным. Структура партыйных органаў будавалася ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем і складалася з райкомаў, падрайкомаў, валасных і сельскіх партыйных ячэяк. Другі з’езд КП(б)Б таксама меў важнае палітычнае значэнне. Ён адбыўся 4–6 сакавіка 1919 г. у Вільні і прыняў рашэнне аб утварэнні адзінай Кампартыі Літвы і Беларусі. З’езд ухваліў стварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Літвы і Беларусі (Літбел). Старшынёй прэзідыўма ЦК КП(б)ЛіБ быў абраны В.С. Міцкявічус-Капсукас. Пасля таго, як Літбел перастаў існаваць, 5 верасня 1920 г. ЦК КП(б)ЛіБ прыняў пастанову аб стварэнні самастойных кампартый (бальшавікоў) Беларусі і Літвы і асобных органаў іх кіраўніцтва. Пачалося аднаўленне мясцовых партыйных органаў. У перыяд з 1920 па 1993 гг. з’езды КПБ праводзіліся рэгулярна ў г. Мінску (часцей – адзін раз у два гады) [4].

У 1920-я гг. у БССР адбыўся пераход ад шматпартыйнай да аднапартыйнай палітычнай сістэмы. Бальшавікі вялі барацьбу супраць апазіцыйных сіл, якія існавалі ў Беларусі. Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў або БПС-Р) адмовілася падпісаць «Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь» (31 ліпеня 1920 г.), якая не адпавядала яе палітычным поглядам, і аб’явіла сябе палітычнай апазіцыяй. У 1921 г. было арыштавана 860 членаў партыі. Яны былі перапраўлены ў Заходнюю Беларусь, якая знаходзілася пад уладай Польшчы. Былі разгромлены і фактычна спынілі сваю дзейнасць Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў. У 1921 г. Бунд аб’яднаўся з КП(б)Б. У 1924 г. самараспусціліся беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў і партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (расійская). Да 1925 г. на тэрыторыі БССР афармілася аднапартыйная палітычная сістэма. Дзейнічала толькі кіруючая КП(б)Б, якая з’яўлялася часткай ВКП(б) – Усерасійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў), якая з 1952 г. стала называцца Камуністычнай партыяй Савецкага Саюза (КПСС) [5, с. 11]. З другой паловы 1980-х гг. пад уплывам палітыкі перабудовы адбывалася дэмакратызацыя грамадскага жыцця. У гэты час актыўна ствараюцца розныя аб’яднанні і клубы. Яны мелі грамадска-палітычную, вытворча-тэхнічную, прыродазнаўчую, мастацкую накіраванасць, выступалі ў абарону культурнай спадчыны. У гэты перыяд з’явіліся такія арганізацыі, як «Талака», «Тутэйшыя», «Світанак», «Узгорье», «Беларуская хатка», гісторыка-мемарыяльная камісія Беларускага Фонду

культуры. Паступова іх дзейнасць становіцца палітызаванай. У чэрвені 1989 г. у Вільнюсе адбыўся ўстаноўчы з’езд Беларускага Народнага фронту «Адраджэнне». Гэта была некамуністычная апазіцыйная арганізацыя [6, с. 185].

28 лістапада – 1 снежня 1990 г. адбыўся XXXI з’езд КПБ. Пад час яго працы ўпершыню была дадзена крытыка дзейнасці ЦК КПСС і Генеральнага сакратара М.С. Гарбачова. Было ўзнята пытанне пра неабходнасць правядзення палітыкі, якая б адпавядала нацыянальным інтарэсам. З 1990 г. назіралася дэпартызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый. З шэрагаў партыі выходзілі радавыя члены, скарачалася колькасць жадаючых уступіць у партыю [4]. Важную ролю ў фарміраванні шматпартыйнай сістэмы адыграла прыняцце ў студзені 1990 г. рашэння з’езда народных дэпутатаў СССР аб адмене артыкула 6 Канстытуцыі СССР. Гэта азначала ліквідацыю манаполіі КПСС на ўладу [13, с. 185]. 28 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову «Аб рэгістрацыі грамадскіх аб’яднанняў у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы». Гэты дакумент вызначаў парадак рэгістрацыі палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў. У кастрычніку 1990 г. з’явілася «Часовае палажэнне аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў грамадзян Беларускай ССР» . У адпаведнасці з дакументам заснавальнікамі партыі маглі стать грамадзяне БССР у колькасці 100 чалавек. Шматпартыйнасць у Беларусі пачала афармляцца ў пачатку 1990-х гг. [2, с. 503]. Актывізацыі гэтага працэсса паспрыяла пастанова «Аб часовым прыпыненні дзейнасці КПСС–КПБ на тэрыторыі Беларусі», якая была прынята 25 жніўня 1991 г. Вярхоўным Саветам БССР. Гэты дакумент прывёў да крызісу КПБ і перадачы партыйнай уласнасці дзяржаве. Пастанова была адменена толькі у 1993 г. [4].

У 1990 г. адбыліся ўстаноўчыя сходы Нацыянальна-дэмакратычнай партыі беларусаў і Аб’яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі (партыі былі зарэгістраваны Мінюстам у 1991 г.) У 1991 г. былі створаны Беларуская сялянская партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, Беларуская Хрысціянска-дэмакратычная партыя «Злучнасць». 1992 г. былі зарэгістраваны Партыя камуністаў Беларуская, Аграрная партыя, Партыя Славянскі сабор «Белая Русь», партыя «Беларускі навукова-вытворчы кангрэс». У 1993 г. афармілісяБеларуская партыя «зялёных», Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці, Партыя аматараў піва [3, с. 80-94]. У 1994 г. з’явіліся Беларуская партыя працы, Ліберальна-дэмакратычная партыя, Беларуская гуманітарная партыя, Беларуская экалагічная партыя,

Рэспубліканская партыя, Беларуская нацыянальная партыя, палітычная партыя гендэрнага тыпу – Беларуская партыя жанчын «Надзея».

У працэсе стварэння палітычных партый у Беларусі даследчыкі вызначаюць тры перыяды: 1991–1994 гг., 1995–1998 гг. і з 1999 г. На першым этапе палітычныя партыі былі нешматлікімі і актыўна вялі барацьбу за суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь. На другім этапе колькасць палітычных партый значна павялічылася. Дзейнічалі «рэестравыя» і «фармальныя» партыі. «Рэестравыя» партыі працавалі актыўна і вялі барацьбу за падтрымку электарату. «Фармальныя» партыі былі зарэгістраванымі, але не выконвалі патрабаванняў заканадаўства. На трэцім этапе колькасць палітычных партый скарацілася. Партыі, якія не вытрымалі канкурэнцыі і не знайшлі падтрымкі сярод насельніцтва, спынілі сваю дзейнасць [2, с. 553-554].

5 кастрычніка 1994 г. быў прыняты закон «Аб палітычных партыях» (19 ліпеня 2005 г. была прынятая новая рэдакцыя дадзенага закона). З гэтага часу пачаўся новы этап партыйнага будаўніцтва. Закон замацаваў тэрытарыяльны прынцып партыйнай структуры і забараніў стварэнне партый явачным парадкам. Для дзейнасці партыі неабходна было падаць у Міністэрства юстыцыі дакументы (заяву, статут, праграму, пратакол устаноўчага з'езда і іншыя дакументы) і прайсці працэдуру дзяржаўнай рэгістрацыі. Акрамя таго палітычныя партыі павінны былі мець у сваім складзе 500 чалавек. Прыняцце новага закона не прыпыніла працэс стварэння новых палітычных партый. Працэс гэты праходзіў паступова. Так, у 1995 г. былі зарэгістраваны Беларуская рэспубліканская партыя, Беларуская аб'яднаная спартыўная партыя, Партыя «Хрысціянска-дэмакратычны выбар», Народная партыя «Адраджэнне», Працiя «Ачышчэнне», Аб'яднаная грамадзянская партыя [3, с. 80-94]. У 1995 г. было зарэгістравана 34 партыі.

За першую палову 1990-х гг. была створана значная колькасць партый. Працэсс афармлення шматпартыйнай сістэмы у Беларусі ішоў і надалей. У 1996–1997 гг. былі зарэгістраваны Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя «Народная грамада», Беларуская партыя «За сацыяльную справядлівасць», Камуністычная партыя Беларусі, Сацыял-дэмакратычная партыя Народнай Згоды [3, с. 80-94]. У рэспубліцы сфармавалася сістэма партый розных па колькаснаму складу, сацыяльнай прыналежнасці членаў, ідэалагічнай накіраванасці. Так, у 1998 г. у рэспубліцы было афіцыйна зарэгістравана 41 палітычная партыя. Аднак не ўсе партыі ажыцяўлялі палітычную дзенасць, некаторыя самаліквідаваліся. Наяўнасць вялікай колькасці палітычных партый ускладняла выбар грамадзян падчас выбараў. У 1998 г.

Міністэрства юстыцыі ажыцявіла праверку дзейнасці палітычных партый Беларусі. Па выніках праверкі Вярхоўны Суд  Рэспублікі Беларусь прыпыніў дзейнасць некаторых партый.

26 студзеня 1999 г. быў выдадзены дэкрэт Прэзідэнта «Аб некаторых мерапрыемствах па уладкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадзянскіх аб'яднанняў». У адпаведнасці з дакументам у складзе кожнай партыі павінна была налічвацца 1000 членаў, а ў абласцях рэспублікі і г. Мінску павінны былі дзейнічаць партыйныя арганізацыі. Для рэалізацыі дакумента была створана Рэспубліканская камісія па рэгістрацыі і перарэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў. Склад камісіі быў прызначаны Прэзідэнтам. З 27 партый (па стане на 26 студзеня 1999 г. ) дакументы на перарэгістрацыю падалі 19 партый. З іх дзвюм партыям – Беларускай хрысцінска-дэмакратычнай злучнасці і Партыі разумнага сэнсу – было адмоўлена ў перарэгістрацыі [2, с. 540]. У выніку на 1 снежня 1999 г. у Беларусі дзейнічала 17 партый, а на 1 студзеня 2009 г. іх налічвалася 15. Гэта лічба застаецца нязменнай і да сённяшняга часу [7].

Такім чынам, працэс стварэння палітычных партый і фарміравання шматпартыйнай сістэмы інтэнсіўна праходзіў з 1990-х гг. У гэты час былі створаны ўсе сучасныя партыі. Яны з'яўляюцца важным элементам жыцця грамадства. Прадстаўнікі палітычных партый прымалі ўдзел у парламенцкіх выбарах 1995, 2000, 2004, 2008, 2012, 2016, 2019 гг. Найбольшая актыўнасць назіралася ў 1995 г., калі праходзілі выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання. Так, у парламент прайшлі прадстаўнікі 16 партый (106 дэпутатаў) і 96 беспартыйных дэпутатаў. Месцы ў Вярхоўным Савеце атрымалі: Партыя камуністаў Беларуская (45), Аграрная партыя (33) Партыя народнай згоды (8), Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі (5), Беларуская сыцыял-дэмакратычная Грамада (2), Партыя усебеларускага адзінства і згоды (2), Грамадзянская партыя (2). Беларускі патрыятычны рух, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці, Сялянская, Народная, Сацыялістычная, Сацыяльна-спартыўная, Экалагічная партыя, Партыя працы і партыя «зялёных» атрымалі па аднаму мандату [2, с. 533].

Колькасць абраных дэпутатаў ад партый на выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў перыяд з 2000 па 2019 гг. прадстаўлена ў наступнай табліцы.

| Назва партыі | Абраныя дэпутаты | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2000 | 2004 | 2008 | 2012 | 2016 | 2019 |
| Сацыял-дэмакратычная партыя Народнай Згоды | 1 | | | | | |
| Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці | 2 | | | 1 | 3 | 6 |
| Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя | 1 | | | | | |
| Ліберальна-дэмакратычная партыя | 1 | 1 | | | 1 | 1 |
| Аб'яднаная грамадзянская партыя | | | | | 1 | |
| Камуністычная партыя Беларусі | 6 | 8 | 6 | 3 | 8 | 11 |
| Беларуская аграрная партыя | 5 | 3 | 1 | 1 | | 1 |
| Беларуская патрыятычная партыя | | | | | 3 | 2 |
| Агульная колькасць | 16 | 12 | 7 | 5 | 16 | 21 |

Такім чынам, палітычныя партыі прымалі ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны. Яны ўдзельнічалі ў выбарчых кампаніях, мелі сваіх прадстаўнікоў ў парламенце. Аднак электаральны рэйтынг палітычных партый быў невысокім. У перыяд з 2000 па 2019 гг. насельнцтва падчас парламенцкіх выбараў аддавала свае галасы прадстаўнікам 8 палітычных партый з 15 зарэгістраваных у Беларусі. Агульная колькасць дэпутатаў, абраных у парламент, вагалася за гэты перыяд ад 5 да 21 чалавек. Можна адзначыць, што працэс станаўлення шматпартыйнасці ў Беларусі мае свае асаблівасці. Большасць беларускіх палітычных партый нешматлікія, не маюць строга вызначанай сацыяльнай базы і канструктыўнай праграмы палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Партыйная сістэма Рэспублікі Беларусь знаходзіцца ў стадыі развіцця.

1. Гісторыя Беларусі: падручнік: У 2 ч. Ч. 1. Люты 1917 – 2004 г. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2007. – 416 с.

2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн 2 / М.У. Смяховіч [і інш.], рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]: Нац. Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. Навука, 2012. – 654 с.

3. Кузнецов, Н.В. Политические партии: от древних времен до современной Беларуси: учебно-методическое пособие / Н.В. Кузнецов. – Мн. : Мисанта, 2006. – 126 с.

4. Кушнер, В. Камуністычная партыя / В. Кушнер // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі,: У 6 т. Т. 4. – Мінск : БелЭн,1997 – 432 с.

5. Политические партии Беларуси – необходимая часть гражданского общества: материалы семинара / Авт.-сост. А. Федута, О. Богуцкий, В. Мартинович. – Минск: Фонд имени Фридриха Эберта, 2003. – 113 с.

6. Романовский, И.Ф. Современные политические партии Беларуси: генезис, динамика развития, проблемы /И.Ф. Романовский // Працы гістарычнага фа-

культэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк.рэд.) [і інш.] – Мінск: БДУ, 2007. – С. 185–188.
7. Сведения о политических партиях. Зарегистрированных в Республике Беларусь [Электронны рэсурс].–Рэжым доступу:https://minjust.gov.by/directions/compare_coverage/registration/information/ – Дата доступа: 21.07.2020.

**POLITICAL PARTIES AND PUBLIC ASSOCIATIONS IN BELARUS: A RETROSPECTIVE REVIEW**

***Sugako N. A.***
*Belarusian state University of Informatics and Radioelectronics, Minsk, Belarus*

The article is devoted to the history of creation and activity of political parties in Belarus. The process of party formation from the 19th century to the present is considered.

***Keywords: political party, multiparty system***